50. Provinz und Metropole. Zum Verhältnis von Regionalismus und Urbanität in der Literatur / [Hrsg. Dieter Burdorf, Stefan Matuschek]. – 1. Aufl. – Heidelberg : Winter, 2008. – 420 S. – (Beiträge zur neueren Literaturgeschichte. – Bd. 254).
51. Räume und Grenzen in Österreich-Ungarn 1867–1918 : kulturwissenschaftliche Annäherungen / [hrsg. von Wladimir Fischer, Waltraud Heindl, Alexandra Millner und Wokfgang Müller-Funk]. – Tübingen : Francke, 2010. – 409 S. – (Kultur – Herrschaft – Differenz. – Bd. 11).
52. Zentren, Peripherien und kollektive Identitäten in Österreich-Ungarn / [Hrsg. Endre Hárs, Wolfgang Müller-Funk, Ursula Reber und Clemens Ruthner]. – Tübingen und Basel : Francke, 2006. – 1. Aufl. – VI, 295 S. – (Kultur – Herrschaft – Differenz. – Bd. 9).
53. Zwischen Zentrum und Peripherie : die Metropole als kultureller und ästhetischer Erfahrungsraum / [Hrsg. : Christian Moser]. – Bielefeld : Aisthesis-Verl., 2005. – 391 S.

**Исапчук Юлия. Оппозиция центра и периферии, или провинция versus метрополия в современном литературоведении.** В статье анализируется характер взаимодействия бинарной пары центр и периферия на основе имманентной амбивалентности ее составляющих. Рассматривается изучение этих явлений в немецкоязычном литературоведении на фоне освещения темы родины и региона в художественной литературе. Прослеживается указанная проблематика в современной российской гуманитаристике с выделением концепта русской провинции как национального феномена, сопровождаемого теоретическим обоснованием общего видения образа провинции. Освещаются также исследования этого концепта в украинском научном дискурсе. Подчеркивается роль становления провинциологии как нового междисциплинарного направления гуманитарных наук. Делается попытка аргументировать провинцию и метрополию в качестве современных литературоведческих понятий. В частности обращается внимание на рецепцию провинции как социокультурного феномена: сентиментальная «провинция», «имперская формула провинции», миф и провинция, провинциальный комплекс столичности.

**Ключевые слова:** провинциология, центр, периферия, провинция, метрополия.

**Isapchuk Yulia. The Opposition of Center and Periphery or Province Versus Metropolis in the Modern Literary Criticism.** The article examines the interaction's character of the binary pair of center and periphery, based on the inherent ambivalence of its components. The study of these phenomena is considered in the German-speaking literary criticism on the ground of the development of the topic «homeland and region» in the literature. These problems are analyzed in the modern Russian humanities with an emphasizing of the concept of the Russian province as a national phenomenon, followed by a theoretical explanation of a common vision of the province's image. The research of this concept is also highlighted in the Ukrainian scientific discourse. The formation of provintsiologiya (province's study) is stressed as a new interdisciplinary humanities' direction. The attempt is made to identify province and metropolis as the modern literary concepts. In particular the attention is focused on the reception of the province as a sociocultural phenomenon: sentimental «province», «imperial formula of province», the myth and the province.

**Key words:** province's study, center, periphery, province, metropolis.

Стаття надійшла до редколегії 08.11.2016 р.

**УДК 821.161.3.09(092)**

**Надзея Кахновіч**

# Канцэпцыя чалавека ў творчасці Максіма Гарэцкага: антрапалагічная перспектыва

Паказваецца актуальнасць літаратуразнаўчых даследаванняў, прысвечаных канцэпцыі чалавека, выяўленню яго сутнасці ў нацыянальнай мастацкай літаратуры ў кантэксце «антрапалагічнага павароту» ў сучасным навуковым дыскурсе. На прыкладзе творчасці М. Гарэцкага (з улікам дасягненняў сінергетыкі як навукі, якая вывучае складаныя няўстойлівыя сістэмы ў развіцці) пацвярджаецца заканамернасць крызісаў у быцці асобы, абумоўленую яе амбівалентнасцю.

**Ключавыя словы:** праблема чалавека, «антрапалагічны паварот», амбівалентнасць асобы, духоўны крызіс, сінергетыка.

**Пастаноўка навуковай праблемы і яе значэнне.** Даследаванне канцэпцыі чалавека ў творчасці М. Гарэцкага абумаўлена, па-першае, неабходнасцю сістэматызацыі назіранняў над прозай пісьмен-

© *Кахновіч Н., 2016*

ніка, што вяліся рознымі даследчыкамі XX – пачатку XXI ст. Па-другое, новымі поглядамі на заканамернасці беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя і новымі навуковымі падыходамі да асэнсавання літаратурных з'яў літаратуразнаўствам, звязанымі з «антрапалагічным паваротам» ў сістэме сучасных гуманітарных ведаў. Творчасць М. Гарэцкага як пісьменніка-аналітыка аказалася надзвычай важнай для станаўлення беларускай літаратуры пачатку XX ст. і патрабуе адпаведнай ацэнкі ва ўмовах новай культурнай сітуацыі на мяжы тысячагоддзяў.

**Аналіз даследаванняў дадзенай праблемы.** На сёняшні дзень вядомы многія даследаванні творчай спадчыны М. Гарэцкага. Гэта працы А. Адамовіча, В. Каваленкі, Д. Бугаёва, М. Мушынскага, І. Чыгрына, М. Мішчанчука, М. Тычыны, В. Максімовіча, Т. Дасаевай, Т. Тарасавай, А. Макарэвіча і інш. Перыядычна, з 1993 г. праходзяць «Гарэцкія чытанні». Але, улічваючы маштабы самой асобы М. Гарэцкага як пісьменніка-філосафа, даследчыка псіхалогіі чалавека, новыя гарызонты сучаснага навуковага дыскурсу, зробленага недастаткова. Знаўцы творчасці празаіка адзначалі важнасць для яго экзістэнцыяльных пытанняў, разглядалі ідэйна-мастацкую эвалюцыю, праблематыку і паэтыку, пытанні аўтабіяграфізму, тыпалогіі нацыянальнага характару яго твораў [2, 7, 13, 15, 16]. Аднак цэласнага погляду на канцэпцыю чалавека ў творчасці М. Гарэцкага пакуль не выпрацавалася.

**Мэта і задачы артыкула.** Улічваючы дасягненні сучаснага гарэцказнаўства і арыентуючыся на высновы сістэмнага, комплекснага падыходу да чалавека, ставім на мэце выявіць характэрныя для прозы М. Гарэцкага прынцыпы паказу жыцця чалавечай асобы. Наша задача вызначыць дамінантныя рысы персанажнай антрапалогіі пісьменніка, якія б характарызавалі арыгінальнасць яго мастацкай канцэпцыі. Паколькі для М. Гарэцкага важным было адлюстраванне духоўных крызісаў асобы, то, на наш погляд, лепш апісаць іх магчыма з дапамогай сінергетыкі – метадалогіі вывучэння няўстойлівых сістэм, якія знаходзяцца ў развіцці. Канцэптуальныя падыходы дадзенай тэорыі ўсё часцей знаходзяць сваё пасляховае прымяненне ў розных сферах гуманітарных ведаў і могуць быць выкарыстаны і ў літаратуразнаўстве [8, 9].

**Выклад асноўнага матэрыялу і абгрунтаванне атрыманых вынікаў даследавання.** Праблема чалавека стала апошнім часам тым фокусам, у святле якога, вядуцца даследаванні ў самых розных галінах навуковай дзейнасці, краевугольным каменем, якім сёння апрабіруюцца новыя навуковыя адкрыцці. Акрамя таго, менавіта чалавек, у яго складаных узаемасувязях са светам, выступае прадметам даследавання, які вядзе ў перспектыве да сінтэзу розных навук. «Праблематыка чалавека з новага, нярэдка незвычайнага, боку становіцца цэнтральнай для многіх дысцыплін…» [10, с. 10]. Вядомы даследчык беларускай літаратуры М. Тычына адзначае, што «сучасная цывілізацыя, прайшоўшы прыродацэнтрычны і богацэнтрычны этапы ў эвалюцыі homo sapiens, уступае ў новую фазу гістарычнага развіцця, якую называюць антрапацэнтрычнай» [14, с. 17]. Таму «антрапалагізацыя» [1, с. 4] літаратуразнаўства сёння з'яўляецца заканамернай з'явай. Тым больш, што мастацкая літаратура як чалавеказнаўства развіваецца ў цеснай сувязі не толькі з грамадска-гістарычнымі зменамі, але з тымі зменамі, што назіраюцца ў навукова-тэарэтычным пазнанні быцця і чалавека.

Уяўленні пра чалавека і свет на працягу развіцця слоўнага мастацтва ўсё больш ускладняліся, гэта адбівалася на сродках і спосабах адлюстравання характару чалавека, станаўленні і развіцці адпаведных літаратурных напрамкаў і стыляў. Складанасць, шматвектарнасць развіцця сучаснай літаратуры з'явіліся заканамерным вынікам эвалюцыі мастацкага пазнання. З развіццём жа паказу чалавека ў літаратуры суадносіцца і эвалюцыя літаратуразнаўчых катэгорый і метадалогій яе даследавання. Сёння гаворыцца пра комплексны падыход да вывучэння чалавека. Даследчык Я. Гарадніцкі адзначае, што «у наш час рознымі гуманітарнымі дысцыплінамі звяртаецца пільная ўвага на такое паняцце, як сістэма» [3, с. 6]. Сістэмны, комплексны падыход да чалавека – кірунак, у якім развіваюцца на сучасным этапе гуманітарныя навукі. Чалавек разумееца як унікальная, адкрытая, актыўная, амбівалентная сістэма, здольная да самапазнання, самазмянення і самаразвіцця. Такі падыход дае новыя перспектывы і літаратуразнаўчай навуцы.

Уяўленні пра чалавека як пра адкрытую сістэму атрымалі шырокае распаўсюджанне пасля даследаванняў Л. фон Берталанфі, аднаго з заснавальнікаў агульнай тэорыі сістэм. Ён разглядаў чалавека як адкрытую арганізаваную дынамічную сістэму, здольную функцыянаваць незалежна ад пачатковых умоў яе існавання. Чалавек як адкрытая сістэма існуе ў няспынным ўзаемадзеянні са сваім акружэннем, ён адкрыты свету праз свае паводзіны, дзейнасць. Паміж чалавекам і светам адбываецца пастаянны абмен: чалавек нешта атрымлівае ад свету і ў сваю чаргу нешта аддае яму,

уплывае на яго. Таму *няспыннае станаўленне* – асноўная форма існавання асобы, з якой звязана яе ключавая супярэчнасць: цэласнасць і аднačасова адкрытасць другому «Я», свету. Гэта значыць, што асоба, з аднаго боку, вызначаецца завершанасцю, а з другога – незавершанасцю. Таму многія прадстаўнікі гуманістычнай псіхалогіі разглядалі асобу як працэс, у якім праяўляецца фенаменальнае адзінства сённяшняга, мінулага і будучага (А. Маслоу, К. Роджэрс, К. Гольдштэйн). Асоба не ўяўляе сабой статычны стан чалавека. Яна як бы прасціраецца праз час: існуе ў сучаснасці, помнячы пра мінулае і прадугадваючы будучае. Паміж часавымі характарыстыкамі існавання чалавека таксама існуе пастаяннае ўзаемадзеянне: мінулае можа пераасэнсоўвацца пад уздзеяннем актуальнага вопыту, а перспектыва будучага можа быць пераасэнсавана.

Свет мастацкай літаратуры ў цэлым (як і творчасць асобных пісьменнікаў), сёння неабходна ўспрымаць як дынамічную сістэму, якая самаарганізуецца па пэўных законах, як другую жыццёвую (своеасаблівую віртуальную) рэальнасць. У ёй таксама нічога не ўзнікае і не знікае бясследна. «Мастацкі свет можна ахарактарызаваць як сусвет, што пашыраецца (расширяющаяся Вселенная) ад свядома-неўсвядомленых уяўленняў і комплексаў індывідуума, асацыятыўна структураваных вобразаў і паняццяў, звязаных з асабістым экзістэнцыяльным вопытам і гістарычнай памяццю пакаленняў, да анталагічных катэгорый, архетыпаў» [3, с. 21]. У сувязі з гэтым, можна смела сказаць, што новае XXI стагоддзе для айчыннага літаратуразнаўства – гэта час новага канцэптуальнага прачытання твораў класікаў і сучаснікаў беларускай літаратуры. Нягледзячы на крызіс асобы ў мастацтве навейшага часу, для беларускага літаратуразнаўства і крытыкі гэта якраз час паглыбленага пазнання асобы чалавека, асэнсавання яго межаў і сутнасці па тым, як яны выявіліся з дапамогай мастацтва слова ў розныя перыяды яго развіцця.

Сучасная сітуацыя стану беларускага літаратурнага працэсу, пытанне вызначальных каардынат духоўна-культурнага быцця нацыі на пачатку XXI ст. асацыятыўна вяртае нас да пачатку мінулага стагоддзя. Не столькі таму, што «гісторыя паўтараецца», колькі з улікам таго, што перыяд савецкага дыскурсу ў гісторыі беларускай літаратуры, «перакрыў» паветра для альтэрнатыўнага у адносінах да савецкай сацрэалістычнай літаратуры мастацкага досведу. Такім чынам, у духоўным плане меўся недахоп засваення анталагічна сутнасных, глыбінных пластоў грамадскай і індывідуальнай свядомасці; у літаратуры – іншых мастацкіх форм, падыходаў, тыпаў арганізацыі мастацкага тэксту.

Сучасная сітуацыя, як у літаратуры, так і ў літаратуразнаўстве, – гэта вяртанне да пачатку XX ст., да таго, што было перарвана, не атрымала свайго паўнацэннага развіцця. Як слушна піша Т. Аўтуховіч, цікавасць літаратуразнаўчай навукі да антрапалагічных праблем абумоўлена імкненнем аднавіць цэласны вобраз чалавека ў літаратуры і пошукам новых канцэптуальных адказаў на пытанне «што ёсць чалавек», таму што ««чалавечы крызіс», які вызначыўся на мяжы XIX–XX ст., калі чалавек усвядоміў сваю значнасць у якасці суб’екта гісторыі <…> у той жа час выявіў богапакінутасць і анталагічную няўтульнасць» [1, с. 3]. Як бачым, вострыя пытанні мяжы XIX–XX ст. зноў паўсталі на новым пераходным этапе. Сучасная постмадэрністычная сітуацыя – адбітак чарговага крызісу свядомасці, які быў характэрны пачатку мінулага стагоддзя. Тады ў грамадстве ўзнікла вострае адчуванне крызісу, што ахапіў усе слаі грамадскага жыцця. Аказаліся вычарпанымі тыя каштоўнасці, якія стымулявалі грамадскую свядомасць і літаратуру ранейшага часу (другой паловы XIX ст.). У беларускай сацыякультурнай прасторы адбываюцца зрухі, звязаныя з ідэяй нацыянальнага адраджэння, неабходнасцю абуджэння народа да паўнацэннага сацыяльна-культурнага жыцця.

Мастацтва выяўляе светапогляд найбольш адчувальнай да грамадскіх зменаў передавой часткі грамадства, надзеленай правідэнцыяльнай функцыяй. Асабліва гэта тычыцца творцаў, якія вызначаюцца абвостраным светапачуваннем, неардынарнасцю, своеасаблівай творчай манерай. Адным з такіх правідцаў у беларускай літаратуры пачатку XX ст. несумненна быў Максім Гарэцкі. Яго проза стала выяўленнем глыбіннага творчага патэнцыялу маладой беларускай літаратуры, духоўнай сутнасці народнага жыцця. Пісьменнік фактычна распрацаваў аналітычна-філасофскі накірунак беларускай прозы, рэалізоўваў на практыцы патрэбу ў глыбокім спасціжэнні нацыянальнага характару, выказаную пад час вядомай «нашаніўскай дыскусіі». Творчая манера М. Гарэцкага раскрывала перавагі псіхалагічнага падыходу да тлумачэння рэаліяў жыцця беларусаў на пачатку XX ст., садзейнічала выяўленню заканамернай для псіхалагічнай прозы цікавасці да супярэчнасцяў душы чалавека. Экзістэнцыяльная праблематыка вызначыла вобразныя і сэнсавыя дамінанты прозы М. Гарэцкага. Ён першы ў беларускай прозе вывеў чалавека-беларуса з вузка нацыянальнага і

сямейна-бытавога кантэксту на шырокія абсягі агульначалавечай вартасці і значнасці. Пісьменнік паставіў перад сабой і ўсёй літаратурай задачу выяўлення ментальна-беларускага ў беларусе, паказу яго шматграннай асобы. Вядома, што беларуская проза пачатку XX ст. развівала традыцыі, закладзеныя Ф. Багушэвічам і К. Каганцом. Асноўным яе прадстаўніком быў Я. Колас, які ў нашаніўскі перыяд сваёй творчасці асноўную ўвагу скіроўваў на адлюстраванне сацыяльных і нацыянальных аспектаў сялянскага жыцця, вясковага побыту. Абсягі ж тэматыкі і праблематыкі, з якімі ўвайшоў у літаратуру М. Гарэцкі, былі шырэйшыя і больш разнастайныя. Цэнтральны герой яго прозы – інтэлігент у першым пакаленні – нёс з сабою адметныя погляды, думкі і пачуцці. Адштурхоўваючыся ад канкрэтнай сацыяльна-маральнай і нацыянальнай праблематыкі тагачаснага жыцця беларуса, Гарэцкі выходзіў да паказу таямніц быцця, ўсёй сукупнасці праблем, звязаных з чалавекам як феноменам. Аўтарытэтны даследчык творчасці М. Гарэцкага М. Мушынскі лічыць, што менавіта гэты пісьменнік не проста пашыраў тэматычныя абсягі беларускай літаратуры, якая да Гарэцкага мела сацыяльна-побытавы характар, а ўздымаў яе на новы эстэтычны ўзровень, ставіў побач з іншымі літаратурамі свету [12, с. 4]. У асобе М. Гарэцкага беларуская проза ўпершыню выйшла на абсягі ўніверсальнага мастацкага асэнсавання рэчаіснасці, да складанай інтэлектуальна-філасофскай праблематыкі.

Эвалюцыя паказу чалавека ў нацыянальным мастацтве слова, як і ў любым іншым, рухалася перш за ўсё ў напрамку ад статычнага да дынамічнага прынцыпу адлюстравання. Паняцці с*татычнае і дынамічнае* акрэсліваюцца даследчыкам Я. А. Гарадніцкім як дамінантныя катэгорыі, якія «аказваюць надзвычай істотнае ўздзеянне на мастацкую свядомасць, і ад спецыфікі суадносін якіх у канчатковым выніку залежыць характар мастацкай парадыгмы пэўнай літаратурнай эпохі і ўсяго літаратурна-мастацкага працэсу ў цэлым» [3, с. 23]. Гэтая думка справядлівая і ў адносінах да творчасці асобнага мастака, тым больш, што агульныя тэндэнцыі развіцця літаратуры рэпрэзентуюцца менавіта ў канкрэтных мастацкіх творах.

Мастацкую канцэпцыю, што склалася ў творчасці таго ці іншага пісьменніка, заўсёды цяжка выявіць і аналітычна апісаць, бо яна абумоўленая не рухам нейкай загадзя ўстаноўленай ідэі, а рухам самога жыцця, што пераламляецца ў іншабыцці ў слове. Неабходнасць успрыняцця мастацкага свету пісьменніка як дынамічнай сістэмы асабліва адносіцца да творчасці М. Гарэцкага, які ўвесь час пісаў як бы адну вялікую кнігу пра свой народ. Унутранай сутнасцю гэтай «кнігі», яе дынамічным стрыжнем з’яўляецца менавіта аўтарская канцэпцыя чалавека. Зыходзячы з гэтага, вызначальнай рысай вобразу чалавека ў творчасці М. Гарэцкага з’яўляецца прынцып *дынамізму, рухомасці*, што звязана непасрэдна з глыбінным псіхалагічна-аналітычным падыходам аўтара да асобы чалавека-беларуса. Творчасць М. Гарэцкага сваёй пафаснасцю накіравана супраць стэрэатыпнага, схематычнага ўспрымання жыцця наогул. Дадзеная акалічнасць з’явілася той ісцінай, якую пісьменнік спасцігаў сам разам са сваімі героямі. Падзеі асабістага жыцця аўтара ў непасрэднай сувязі з грамадскімі вызначалі яго творчую эвалюцыю. Таму, асаблівасці вырашэння праблемы чалавека ў творчасці празаіка звязаныя з асаблівасцю яго светаадчування ў розныя перыяды жыцця, што накладвала адбітак на ўсю сістэму вобразаў твораў, іх агульную настраёвасць, прыёмы і сродкі пісьма, індывідуальны стыль.

Храналагічны прынцып пабудовы многіх твораў М. Гарэцкага, мэтанакіраваны пошук пісьменнікам на працягу ўсёй творчасці адказаў на складаныя філасофскія пытанні быцця, назіральнасць і аналітызм аўтара, а таксама складаныя, драматычныя падзеі грамадскага і асабістага жыцця, даюць падставу разглядаць мастацкую канцэпцыю чалавека ў творчасці празаіка як сузалежную ад асноўных перыядаў жыцця і творчасці. Пры тым, *непрадказальнасць, парадаксальнасць* жыцця ў спалучэнні з таямніцай душы чалавека і народа з’явіліся важным накірункам мастацкай свядомасці і дыскурсу празаіка.

Паколькі творчасць М. Гарэцкага вызначаецца асаблівым аналітызмам, «самааналізам», то і героі яго твораў адметныя ў гэтым плане. Гэта героі-думаннікі, якія шукаюць разгадкі складаных пытанняў чалавечага існавання, іх унутраны свет не проста *дынамічны* і *супярэчлівы*, а *«дыялагічны», «антынамічны».* Пісьменнік раскрываў духоўнае багацце і складанасць душы чалавека-беларуса. Калі параўнаць развіццё спосабаў адлюстравання характару чалавека ў беларускай і рускай літаратурах, то можна з упэўненасцю сказаць, што да канцэпцыі чалавека ў творчасці М. Гарэцкага набліжаецца чалавек Ф. Дастаеўскага, унутраны свет якога складаецца з невырашальных супярэчнасцяў, палярна супрацьлеглыя пачаткі якога, самыя светлыя і самыя цёмныя, у сваім складаным адзінстве і барацьбе настолькі раўназначна моцныя, што ад самых светлых пабуджэнняў

у самы кароткі час чалавек можа перайсці да самых цёмных, і наадварот. Але чалавек М. Гарэцкага, ягоныя паводзіны і самапачуванне, у адрозненні ад святых-грэшнікаў Ф. Дастаеўскага абумоўлены ў значнай ступені сваімі роднымі каранямі, нацыянальным менталітэтам і патрэбамі гістарычнага моманту. Праблема выбару, маральныя катэгорыі дабра і зла ў прозе М. Гарэцкага цесна звязаныя з узроўнем самасвядомасці, якасцю самаацэнкі персанажа, ягонай здольнасцю супрацьстаяць умовам неспрыяльнага побыту і жыццёвай неўладкаванасці, пэўным складаным абставінам і агульнаму духоўнаму крызісу. У беларускага пісьменніка няма толькі станоўчых ці толькі адмоўных герояў, але палярнасць душы асобы звязаная не з аднолькавай цягай да дабра (змірэнне) і зла (эгаізм), як у Ф. Дастаеўскага, а з праблемай самаідэнтыфікацыі беларускай маладой інтэлігенцыі, а таксама асобных прадстаўнікоў з простага народа.

Пачатак XX ст. вызначаўся для беларусаў, на думку М. Гарэцкага, спробамі пераадолення духоўнага крызісу, які значна адрозніваўся ад агульнаеўрапейскага экзістэнцыяльнага крызісу. Калі ўвесь заходні свет прыйшоў на мяжы XIX–XX ст. да расчаравання рацыяналізмам і тэхнічным прагрэсам, то сялянскай Беларусі, што жыла рэштамі міфалагічнага светаўспрымання, якраз і не хапала рацыянальнага асэнсавання свету і прагі да культурнага, цывілізаванага жыцця (апавяданні М. Гарэцкага «У лазні», «Роднае карэнне» і інш.). Дэкадэнцкі перыяд маральнага ўпадку і расчараванасці выліўся ў нігілізм і крайні індывідуалізм, ад чаго беларускага інтэлігента магла засцерагчы здаровая народная мараль і вырашэнне вострых сацыяльна-нацыянальных праблем. Песімізм і трагізм герояў многіх твораў М. Гарэцкага быў этапнай з’явай, што дапамагала ўсвядоміць прычыны неўладкаванасці жыцця, каб пераадолець іх. Беларускі аўтар у драматызаванай аповесці М. Гарэцкага «Антон» аптымістычна, хоць і праз слёзы, заяўляе: «І самая гэтая з’ява: плачам стогнем, хныкаем, не ведаем, куды дыбаць, і што гэта ўсім спрыкрылася – добра! Значыцца, рэакцыя ідзе добраю дарожкаю… Ох, як праўве! Няхай даспее…» [5, с. 260].

Як далейшае развіццё сістэмнага падыходу да чалавека выступаюць сёння дасягненні сінергетыкі (ці тэорыі самаарганізацыі). Распрацоўкі гэтай сучаснай метадалогіі вывучэння няўстойлівых сістэм, што знаходзяцца ў развіцці, на нашу думку, могуць быць карыснымі для разумення крызісных духоўных працэсаў у развіцці асобы і грамадства, адлюстраваных у творчасці М. Гарэцкага.

Маючы першапачаткова прыродазнаўчую аснову, сінергетыка сфармавалася ў самастойны перспектыўны міждысцыплінарны накірунак і ўсё больш гуманізуецца. «Яна паступова становіцца чалавекамернай вобласцю ведаў. Адкрываецца плённасць яе прымянення для разумення феномену чалавека і чалавечай культуры, разгадкі таямніц чалавечай свядомасці і псіхікі» [9]. Сінергетыка ўводзіць у навуковы ўжытак сваю ўласную мову, своеасаблівую тэрміналогію. Гэта такія паняцці, як самаарганізацыя, аттрактар, біфуркацыя, дэтэрмінаваны хаос, нелінейнасць і інш., якія пачынаюць шырока выкарыстоўвацца ў сучасных навуковых даследаваннях гуманітарнага кірунку. Для нас жа важным з’яўляецца тое, што сінергетычны падыход сцвярджае ідэю крызісу як станоўчага непазбежнага перыяду самапазнання жывой сістэмы, будзь гэта асоба, гісторыя ці культура. Крызіс адносна чалавечай асобы як адкрытай нелінейнай сістэмы здольнай да самаарганізацыі, з пункту гледжання сінергетыкі – гэта перыяд актывізацыі яе ўнутранага патэнцыялу. Адсюль вынікае важнае заключэнне аб заканамернасцях развіцця чалавечай асобы: стабільныя перыяды ў яе жыццядзейнасці чаргуюцца з нестабільнымі, якія ўяўляюцца пераходнымі этапамі і нясуць у сабе магчымасці якасных новаўтварэнняў. Асоба, з пазіцыі сінергетыкі, – жывая нелінейная сістэма (сацыяльна і культурна інтэграваная), якая валодае механізмамі самаарганізацыі і самарэгулявання. Гэта адкрытая сістэма, «развіццё якой вызначаецца барацьбой двух супрацьлеглых пачаткаў: з аднаго боку, імкненнем зняцця напружання, ураўнаважання свайго ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем, змякчэння канфлікту паміж індывідам і грамадствам і аднаўленню папярэдняга ўраўнаважанага стану, з другога – пошукам пастаяннага напружання, пастаноўкай і рэалізацыяй праектаў, мэтаў, задач, якія кіруюць паводзінамі асобы» [11]. Змены ў грамадстве спрыяюць яе актыўнасці і развіццю. Але ў час вострых сацыяльных крызісаў асоба трапляе ў сітуацыю, якая перавышае яе адаптацыйныя здольнасці, што прыводзіць да страты сэнсу жыцця, пачуцця незадаволенасці, безнадзейнасці і бесперспектыўнасці існавання. Паказчыкам такога стану з’яўляецца самарэфлексія, негатыўнае пераасэнсаванне свайго ранейшага вопыту, страта пачуцця ідэнтычнасці, сумненні наконт свайго месца ў грамадстве, сваёй прыналежнасці да пэўных сацыяльных груп і інш. Перагляд ранейшых каштоўнасцяў, рэфлексія выступаюць ў такім выпадку як своеасаблівы інструмент выбару і сродак

яго абгрунтавання. Аднак паводзіны асобы ў дадзены перыяд становяцца непрадказальнымі. Менавіта гэта назіраецца ва ўчынках герояў твораў М. Гарэцкага «Рускі», «Генерал», «На этапе», «Ціхая плынь», «Меланхолія», «Дзве душы» і інш. Нават для саміх сябе героі М. Гарэцкага не могуць вытлумачыць прычыну пэўных сваіх дзеянняў. У моманты крайне нестабільнага стану пад уплывам знешніх абставінаў герой М. Гарэцкага пачынае дзейнічаць нібы па інэрцыі. Пры такой сітуацыі, згодна з высновамі сінергетыкі, выбар аднаго з магчымых шляхоў паводзінаў, далейшага развіцця асобы залежыць ад уздзеяння выпадковага характару («флуктацыі»). Такое ўздзеянне могуць аказаць самыя розныя з'явы, якія і задаюць асноўны накірунак «пераарганізацыі праблемнага поля, поля пытанняў» [11]. Тым самым наводзіцца парадак у індывідуальнай сістэме каштоўнасцяў, але ўжо на якасна новым узроўні. Крызіс асобы, сітуацыя выбару суправаджаецца гранічным абвастрэннем унутраных супярэчнасцяў, якія не могуць быць вырашанымі, пераадоленымі ў межах ранейшых каардынат, якія вызначаюць сістэму каштоўнасцяў дадзенай асобы.

Канцэпцыя чалавека ў многіх творах М. Гарэцкага суадновіцца з прыведзенымі палажэннямі сінергетыкі. Напрыклад, у дакументальна-мастацкіх запісках М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» даецца апісанне выйсця героя з супярэчлівага стану раздвоенасці. Юнак «з высока ўзнятымі ідэаламі над нізка апушчаным жыццём» пасля баявога «хрышчэня» агнём Першай сусветнай вайны пачынае разумець неабходнасць самасцвярджэння ў гэтым жыцці. Жорсткая расправа над злоўленым на таку голубам, што прыляцеў кляваць зярняты – вынік цяжкай сялянскай працы на зямлі, успрымаецца ў кантэксце твора і ўсёй творчасці пісьменніка не толькі як падсвядомая праява ўвабраных на фронце адмоўных эмоцый, роспачы ад дарэмна патрачаных гадоў і сілаў, але і як перагляд сваіх ранейшых ідэалаў, якія пацярпелі крах. Пасля забойства птушкі герой твора адчувае лёгкасць на сэрцы, нават пачынае спяваць [6, с. 120]. Развітанне з маладосцю і сваімі ранейшымі ідэалістычнымі ўяўленнямі спалучаецца ў героя Гарэцкага з моцным жаданнем рабіць нешта, хоць не вельмі значнае, але карыснае чалавеку, народу.

М. Гарэцкі прыглядаецца да чалавека, да таго, як праяўляецца ягоная чалавечая сутнасць у тых ці іншых абставінах, у антычалавечых умовах, у сітуацыях выбару. Пісьменніка як псіхолага-аналітыка цікавіла, чаму ў экстрэмальных сітуацыях чалавек траціць яснае разуменне таго, што з ім адбываецца, падпарадкоўваецца самаму нязначнаму імпульсу, дзейнічае насуперак самому сабе. Напрыклад, герой апавяданні «Прысяга» Тарас, просты чалавек з невялічкіх, убогіх выселак Пнёўшчына, не ведае чаму даверыцца: свайму сумленню ці людзям, што патрабуюць ад яго прысягі: «Усялякія думкі роіліся ў галаве. Кавалкі ўспамінаў... Давілі галаву. Не было яснасці. Нешта карцела. Як зрабіць: так ці гэтак? Што такое? У чым справа?» [4, с. 199]. Так ён і застаецца ў стане вагання – усё ж развіваецца нібы само сабой, вяршыць над героем свой суд. У апавяданні ж «Рускі» так апісваецца стан героя перад ракавым выстралам: «Рускі павалюхаў марудна і нясkладна, як мядзьведзь. Яго прыцісула тое, што не меў часу падумаць, як гэта што было. Ён хапаўся ўцяміць, ці ўсё добра ён рабіў. І раптам блеснула яму ў галаве, і ён, каб не спазніцца і каб пасля не шкадаваць, што быў варонаю, сказаў сам сабе: "Э, што я за ваяка". І не сказаў, толькі блеснула яму так у галаве... Павярнуўся, злажыўся стрэльбаю і без дум пацісвуў пальцам» [4, с. 156]. Стрэл Рускага ў Астрыяка быў для яго самога нечаканасцю, непасцігальнай, незразумелай. Гэта адгалосак бяздумнага існавання, жыцця па камандзе. Ён забівае бяздумна, пад уплывам нейкага імпульсу, бо хвіліну назад, пры сустрэчы двух ворагаў: «рускага» і «аўстрыяка», аказалася, што яны не толькі не ворагі, а ледзь не браты: адзін і другі – простыя сяляне, адзін – украінец, другі – беларус. У Гарэцкага герой, названы Рускім, не мае ў самім сабе варожых пачуццяў да тых, супраць каго змагаецца. Ён просты селянін далёкі ад палітыкі. «Руськый! Я маю горілку…» – сказаў «аўстрыяк» на ўкраінскай мове пры сустрэчы. «Я табе нічога не зраблю!» – адказаў Рускі зусім лагодна, і смела ўстаў і пайшоў да яго бліжэй» [4, с. 155]. Ворагі павіталіся за руку, як даўнія сябры…

Рознымі шляхамі спрабуюць пераадолець крызісны стан героі М. Гарэцкага. Часта гэтыя шляхі прыводзяць да тупікоў, асабістых катастроф. Адны з іх кідаюцца ў чараўніцтва і містыку (Янка з апавядання «Што яно?», Якуб Цімохавіч з апавядання «Дурны настаўнік»), каб хоць на адзін момант, адным вокам зазірнуць за той бок заслоны. Аднак гэтая «брыдкая, нелагічная» цікавасць не дае жаданых вынікаў. Гэты шлях беларускіх фаўстаў (чараўніцтва) – «страшны і, галоўнае, няпэўны, няпэўны шлях, і гэты шлях – смерць» [4, с. 66]. Другія, як тоўсты, сівы генерал, што згадваецца ў апавяданні «Што яно?» ці Аўтух з «Антона» ў гарэлцы «душу топяць, думы заліваюць». (Гэтае

выйсце, на думку пісьменніка, часцей за ўсё характэрна простаму мужыку). А дзівак Мінка («Што яно?») адмаўляецца ад крывадушнага, фальшывага жыцця людзей і робіцца «ізгоем». Ён хоча жыць так, як жадаецца сэрцу, па-свойму. Уся «парафія» заве Мінку дурнем. Такі канец героя ў мужыцкім стане раўназначны лёсу Уладзіміра З., Ядзі («Рунь»), Мусі («Красаваў язмін») у панскім асяроддзі.

Вялікая небяспека пагражала выхадцам з вёскі, з простага асяроддзя, калі яны пераходзілі да самастойнага, індывідуальнага мыслення. Душэўнай ломкі, «хваробы духу» магла і не вынесці інтэлігенцыя ў першым пакаленні. Існавала пагроза расчаравацца, страціць цікавасць да свайго роднага, стаць перакаці-полем. У «Камароўскай хроніцы» згадваецца настаўнік Іван Іванавіч Мудрыкаў, які пачаў з «рэвалюцыі духу» на вёсцы, але не адолеў усіх жыццёвых выпрабаванняў і завяршыў шарлатанствам, бязвер’ем. Магчыма, ён і паслужыў прататыпам бальшавіка Івана Карпавіча Гаршчка, аднаго з герояў аповесці «Дзве душы». Гаршчок – выхадзец з беларускай вёскі, з той чарады, што заўсёды выяўлялася ў народзе, бягучы ў свет за лёгкім хлебам і вольным жыццём. Значная частка з гэтай чарады, страціўшы роднае карэнне, непрыкаяна тулялася па свеце, марнуючы задарма сваё жыццё. Іван Гаршчок знайшоў сябе ў бальшавізме, адчуў у ім нешта блізкае і роднае, хоць прызнаваўся сабе, што з поўнай шчырасцю мог бы знаходзіцца ў любой партыі. Лозунгам свайго жыцця ён зрабіў словы: «Сячы трэба да карэння!» Палымяны аратар, паважаны сярод рабочых бальшавіцкі кіраўнік залівае сваё пабарваванае крывёю нявінных ахвяр сумленне гарэлкай, збліжаецца з такім жа як сам, толькі з іншай палітычнай падсветкай, Гарэлікам-Гарэшкам. У выніку Гаршчок гіне ад рук свайго духоўнага двайніка Гарэшкі. Трагічны лёс Івана Гаршчка – папярэджанне небяспечнасці так званай «заядласці», сляпога следавання за ідэяй. Згубіўшы арыенцір паміж дабром і злом, не адчуваючы праўды жыццёвага моманту, чалавек сам падманваецца і падманвае другіх. Нягледзячы на пакутлівы стан душы герояў М. Гарэцкага, у творчасці пісьменніка выявілася моцная аптымістычная вера ў стваральныя сілы самога жыцця, у незваротнасць працэсу абуджэння народнага духу, у перамогу адраджэнскіх ідэй па ўваскрашэнню Бацькаўшчыны. Пісьменнік быў перакананы ў пераемнасці лепшых традыцый, далейшым росце і пашырэнні «святой» справы Адраджэння.

**Высновы і перспектывы далейшага даследавання.** Такім чынам, канцэпцыя чалавека ў творчасці М. Гарэцкага вызначаецца па-першае сваім дынамізмам. Яна складвалася пад уздзеяннем жывой плыні жыцця, з набыццём жыццёвага і творчага вопыту самім празаікам. Па-другое, у аснове мастацкай пабудовы вобраза чалавека, апісання ўчынкаў герояў у творах М. Гарэцкага ляжыць найперш не сацыяльная дэтэрмінаванасць, а псіхалагічная характарыстыка. У цэнтры ўвагі многіх твораў празаіка было пытанне самавызначэння, самаідэнтыфікацыі чалавека. І паколькі яе тыповым героем з’яўляўся сялянскі выхадзец, інтэлігент у першым пакаленні, то і праблема раздвоенасці свядомасці, рэфлексіі набывала асаблівую актуальнасць. Пісьменніка цікавіла ўнутранае жыццё чалавека, працэсы станаўлення духоўнай асобы, перажыванне ёю крызісных перыядаў у жыцці. Духоўны крызіс як перыяд вострай барацьбы чалавека з самім сабой згодна заключэнняў сінергетыкі з’яўляецца заканамернай з’явай. Творчасць М. Гарэцкага пацвярджае тое, што гэтая заканамернасць абумоўленая амбівалентнасцю асобы, наяўнасцю ў ёй двух супрацьлеглых пачаткаў: тэндэнцыяй да ўстойлівасці, самазахавання і самааднаўлення і тэндэнцыяй да змянення, якаснага пераўтварэння. На прыкладзе сваіх герояў аўтар выпрабоўваў розныя мадэлі вырашэння сітуацыі духоўнага крызісу асобы, што патрабуе больш дэталёвага апісання.

***Крыніцы і літаратура***


1. Автухович Т. Е. Литературная антропология, антропология литературы – обоснование традиции или поиск новых подходов? / Т. Е. Автухович // Антропология литературы: методологические аспекты проблемы : сб. науч. ст. : в 3 ч. – Ч. 1. / Гродненский гос. ун-т им. Я. Купалы ; ред. кол.: Л. Ф. Луцевич, Н. В. Володина, Т. Е. Автухович, А. Н. Андреев. – Гродно, 2013. – С. 3–10.
2. Атрашкевич В. М. Проблема автобиографизма в белорусской советской художественной прозе 20-х г.: на материале творчества Тишки Гартного, Максима Горецкого, Якуба Коласа : автореф. дис. ... канд. филол. наук / В. Н. Атрашкевич ; АН БССР, Ин-т лит. им. Я. Купалы. – Минск, 1979. – 24 с.
3. Гараднiцкi Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / Я. А. Гараднiцкi ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 206 с.
4. Гарэцкі М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1. – 446 с.
5. Гарэцкі М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – Т. 2. – 416 с.
6. Гарэцкі М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – Т. 3. –398 с.

7. Кажамякін Г. В. Ідэйна-мастацкая эвалюцыя творчасці Максіма Гарэцкага : аўтарэф. дыс. ... канд. філ. навук : 10.01.01 / Г. В. Кажамякін ; Беларускі дзяржаўны універсітэт. – Мінск, 2007. – 21 с.
8. Князева Е. Н. Синергетика как новое мировидение: диалог с И. Пригожиным / Е. Н. Князева, С. П. Курдюмов // Вопросы философии. – 1992. – № 12. – С. 18–19.
9. Князева Е. Синергетический вызов культуре [Электронный ресурс] / Е. Князева // Синергетика и искусство – Режим доступа : http://spkurdyumov.ru/art/-sinergeticheskij-vyzov-kulture/.
10. Лекторский, В. А. Умер ли человек? / В. А. Лекторский // Человек. – 2004. – № 4. – С. 10–16.
11. Мухамеджанова Н. М. Личность в зеркале синергетики [Электронный ресурс] / Н. М. Мухамеджанова // Теорет. журнал «Credo New». – 2010 – № 2. – Режим доступа : http://credonew.ru/content/view/408/62/.
12. Мушынскі М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 543 с.
13. Тарасава Т. М. Беларуская проза XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратуным кантэксце: экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя : аўтарэф. дыс. ... докт. філал. навук : 10.01.01 / Т. М. Тарасава ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. – Мінск, 2013. – 44 с.
14. Тычына М. А. Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай прозе / М. А. Тычына // Русская и белорусская литературы на рубеже XX – XXI веков: к 70-летию каф. рус. лит. : сб. науч. ст. : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т, Белорус. ОО препод. рус. языка и лит.; под ред. С. Я. Гончаровой-Грабовской. – Минск, 2010.– Ч. 1. – С. 16–24.
15. Уткевіч В. І. Тыпалогія нацыянальнага характару ў творчасці Кнута Гамсуна і Максіма Гарэцкага : аўтарэф. дыс. ... канд. філол. навук : 10.01.03 ; 10.01.01: 20.02.2006 / В. І. Уткевіч ; БДУ. – Минск, 2006. – 21 с.
16. Чыгрын І. П. Паміж былым і будучым : проза М. Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – 2-е выд., выпр. – Минск : Бел. навука, 2003. – 166 с.

**Кахнович Надія. Концепція людини у творчості Максима Горецького: антропологічна перспектива.** Показано актуальність літературознавчих досліджень стосовно концепції людини, виявлення її сутності в національній художній літературі в контексті «антропологічного» повороту в сучасному науковому дискурсі. На прикладі творчості М. Горецького (з урахуванням досягнень синергетики як науки, яка вивчає складні нестійкі системи в розвитку) підтверджується закономірність криз у житті особистості, їх зумовленість амбівалентністю людини.

**Ключові слова:** проблема людини, «антропологічний поворот», амбівалентність особистості, духовна криза, синергетика.

**Кахнович Надежда. Концепция человека в творчестве Максима Горецкого: антропологическая перспектива.** Показана актуальность литературоведческих исследований по концепции человека, выявлению его сущности в национальной художественной литературе в контексте «антропологического» поворота в современном научном дискурсе. На примере творчества М. Горецкого (с учётом достижений синергетики как науки, изучающей сложные неустойчивые системы в развитии) подтверждается закономерность кризисов в жизни личности, их обусловленность амбивалентностью человека.

**Ключевые слова:** проблема человека, «антропологический поворот», амбивалентность личности, духовный кризис, синергетика.

**Kakhnovich Nadzeya. The Concept of a Human in Maxim Goretskiy's Works: Anthropological Perspective.** The actuality of the literary study dedicated to human conception and identification of their essence in fiction in the context of «anthropological turn-off» in the modern scientific discussion is shown. The consistency of crisises in the being of an person, stipulated by their ambivalence, is confirmed on the base of M. Goretskiy's works, taking into account the achievements of synergetics as a science studying complicated and unstable systems in development.

**Key words:** problem of a human being, anthropological turn-off, ambivalence of a person, spiritual crisis, synergetics.

Стаття надійшла до редколегії
06.12.2016 р.